# Час выбіраць прафесію

Нягледзячы на тое, што да канца навучальнага года яшчэ ёсць час, большасць выпускнікоў агульнаадукацыйных школ ужо вызначылася з прафесіяй. Засталося зусім крышачку: выбраць каледж ці ўніверсітэт, азнаёміцца з умовамі прыёму і навучання ды паглыбіцца ў падрыхтоўку да ўступных іспытаў.



У Мінскім гарадскім адукацыйным цэнтры "Лідар" прайшла прафарыентацыйная сустрэча з прадстаўнікамі БДУКМ

Звычайна ў ВНУ і ССНУ краіны ў суботу на вясенных школьных канікулах — сёлета гэта 21 сакавіка — праходзіць дзень адчыненых дзвярэй. Традыцыйна будучых абітурыентаў чакаюць у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і ў каледжах нашай галіны.

## ДЗВЕРЫ АДЧЫНЯЮЦЦА...

Акрамя як у агульнапрызначаную дату, дні адчыненых дзвярэй праводзяцца некалькі разоў на год. Так, да прыкладу, у БДУКМ на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый ужо зладзілі сустрэчу з будучымі абітурыентамі. Такое ж мерапрыемства арганізавалі і ў Акадэміі мастацтваў на двух факультэтах — мастацкім, а таксама дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Педагогі лічаць, што падрыхтоўку да творчага іспыту варта пачынаць як мага раней, а каб яна была прадуктыўнай, добра б ведаць, якія патрабаванні прад'яўляюцца да работы. Падчас сустрэчы школьнікі сталіцы, раённых і іншых населеных пунктаў дазналіся, на што ў першую чаргу звяртаць увагу, якія хады ўжываць непажадана і як падаць сябе ў найбольш выгадным святле.

— Мне спадабалася, як усё дакладна і зразумела распавёў адказны сакратар прыёмнай камісіі Андрэй Аніська, — дзеліцца ўражаннямі мінчанка **Лізавета Макарэвіч**. — З улікам яго слоў буду карэкціраваць падрыхтоўку.

Як паведаміла дзяўчына, ёй прыйшлася па душы атмасфера творчасці і добразычлівасці, што пануе ў акадэміі. Але каб не памыліцца ў важным кроку, Лізавета плануе яшчэ з'ездзіць на аналагічную падзею ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.

## НА СВАЕ ВОЧЫ

Актыўна рыхтуецца сустрэць будучых абітурыентаў і іх бацькоў у суботу 21 сакавіка БДУКМ. Тут у межах рэспубліканскай акцыі "Я выбіраю прафесію" правядуць адзіны дзень адчыненых дзвярэй. Гэта ключавое мерапрыемства для тых, хто марыць звязаць жыццё з мастацтвам і культурай. Замест звычайных экскурсій універсітэт прапануе маштабную прэзентацыю ўсіх сваіх магчымасцей. У адным месцы будуць прэзентаваны ўсе факультэты і кафедры ўстановы.

Педагогі разам са студэнтамі зладзяць майстар-класы. Гэта не проста дэманстрацыя ўменняў, а жывое ўзаемадзеянне, і кожны абітурыент зможа атрымаць першыя прафесійныя парады.

Галоўнай адметнасцю мерапрыемства стане тое, што ў ім паўдзельнічаюць прадстаўнікі арганізацый — заказчыкаў кадраў. Рэктар **Наталля Карчэўская** адзначае:

— Правядзенне дня адчыненых дзвярэй менавіта ў такім фармаце дазваляе паказаць жыццё ўніверсітэта незавуаляваным. Абітурыенты могуць пагутарыць з нашымі студэнтамі і выкладчыкамі, задаць ім самыя розныя пытанні — пра вучобу, патрабаванні педагогаў, стыпендыі, умовы пражывання ў інтэрнатах, творчую рэалізацыю і самавыяўленне — і пачуць шчырыя адказы.

Яшчэ выкладчыкі і старшакурснікі не прамінуць выпадку арганізаваць сустрэчу з патэнцыйнымі абітурыентамі як у сярэдніх школах або школах мастацтваў, так і ў адукацыйных лагерах для падлеткаў.

## МАЙСТАР-КЛАСЫ

Лічыцца, што дзень адчыненых дзвярэй — самы прадуктыўны метад прафарыентацыі. Тым не менш практыкуюцца і іншыя формы працы.

Прыкладам, педагогі Акадэміі мастацтваў даюць выязныя майстар-класы ў агульнаадукацыйных школах. Нядаўна такі ўрок па мазаіцы ў рамках прафмерапрыемства "Будучае выбіраю сёння!" у сталічнай СШ № 153 імя А. Талая правяла старшы выкладчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва **Анастасія Чадзій**.

— Каб вы бачылі, як у дзяцей гарэлі вочы! — не хавае задавальнення Анастасія Уладзіміраўна. — Спадзяюся сустрэць кагосьці з іх на занятках у нашых аўдыторыях ужо ў наступным годзе.

Да таго ж у Акадэміі мастацтваў з сакавіка на працягу чатырох месяцаў абітурыенты могуць атрымаць кансультацыю.



Майстар-клас у сталічнай СШ № 153 імя А. Талая правяла выкладчык Акадэміі мастацтваў Анастасія Чадзій



Заняткі ў "Зімовай музычнай акадэміі"

## МУЗЫЧНЫ АЛІМП

Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі — своеасаблівая вяршыня музычнай адукацыі. Сюды трапляюць найлепшыя юнакі і дзяўчаты, якія ўжо маюць пачатковую спецыяльную падрыхтоўку. Таму і прафарыентацыя будуецца па-іншаму.

Да прыкладу, штогод у студзені ладзіцца "Зімовая музычная акадэмія". Падчас яе маладыя выканаўцы праходзяць інтэнсіўнае навучанне ў фармаце майстар-класаў па розных дысцыплінах. Удзельнікі атрымліваюць унікальную магчымасць папрацаваць з педагогамі і таленавітымі студэнтамі, што садзейнічае абмену вопытам і дорыць натхненне.

А летам старшы выкладчык кафедры духавых інструментаў і аркестравага дырыжыравання **Аляксандр Шатаў** збірае пад сваім крылом навучэнцаў каледжаў — баяністаў і акардэаністаў. На працягу тыдня створаны калектыў рэпеціруе, а потым іграе на адкрытых пляцоўках сталіцы. Як зазначыў Аляксандр Уладзіміравіч, удзельнікі праекта лягчэй паступаюць у акадэмію: яны ўжо ведаюць патрабаванні выкладчыкаў, а педагогі, у сваю чаргу, ведаюць, на што здатныя гэтыя юныя музыканты.

Тут, дарэчы, як і ў іншых установах, ладзяцца дні адчыненых дзвярэй, майстар-класы і выязныя мерапрыемствы.

## ПА НАКІРАВАННІ

ВНУ і ССНУ сферы культуры залічваюць абітурыентаў і па мэтавым накіраванні. Каб атрымаць яго, выпускніку школы варта ўжо сёння звярнуцца ва ўстанову, дзе ён мяркуе працаваць. Накіраванне могуць выдаць, калі адміністрацыя зацікаўлена ў канкрэтнай кандыдатуры ў якасці спецыяліста. Аднак неабходна падкрэсліць: гэты дакумент не гарантуе паступленне, а дазваляе ўдзельнічаць у асобным конкурсе сярод мэтавікоў, што, як правіла, значна ніжэйшы за агульны.

**Ірына СТАНКЕВІЧ**
Фота з архіваў устаноў